**Цэна асобнаго нумэру 5 кап**

Год IV Вільня 7 (20) мая 1909 г. № 19.

# Наша Ніва

**Першая Беларуская Газэта з Рысункамі**

**Выходзіць што тыдзень рускімі і польскімі літэрамі.**

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вуліца, д. № 20.**

Цэна з перэсылкою і дастаукою да хаты: на 1 г.—2 р. 50 к,, на 6 мес. — 1 р. 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес. — 25 к. За границаю: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. —2 р., на 3 мес. —1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

## Дзьве песьні.

*(З Ю. Сьвятогора).*

Я палямі іду на чужой старане;
Сьветла зоркі глядзяць у глухой вышыне,
Ды у цёмных садах каля соннай рэкі
Загарэлісь адзін за адным аганькі.
Нехта рэчкай плыве,—плюск ідзе над вадой,—
Звонка песьню пяе нейкай мовай чужой.
Я палямі іду, і нявесела мне,
І гаруе душа у чужой старане.
Але гляну навокола: тая-ж зямля,
Як і ў родным краю, разлегліся паля,
Тые-ж зоркі гарать у глухой вышыне
На чужой старане.
А як песьню пачуў, што над рэчкай зьвініць,
Хвалей вольнай, жывой з-за курганоў бяжыць,—
Я пазнаў чагось свойскаго многа у ей:
Калісь чуў гэта ў песьнях старонкі сваей...
Гэтак льюцца яны, гэтак ціха дрыжаць
І, паўнюткі нуды, горка плачуць, зьвіняць...
І, збудзіўшысь душой, чую ўжо з-над рэкі,
Хоць і ў мове чужой, сэрцу гук дарагі.

Ціха полем іду я і думаю ў мгле:
Людзі тые-ж і тут, што ў маей старане;
Іх здалёку агні мяне квапяць, завуць,—
Так жэ любяць яны, так жэ песьні пяюць.
Людзям гэтым чужым у далёкім краю
Я радзімую песьпю сьпяю.
Я палямі іду на рэку к аганьку,
Гулка песьню у родным пяю языку.
Льецца, льецца яна, жаласьліва зьвініць,
Поўна скаргі, трывог над палямі ляціць...
І ніхто на рэцэ не шуміць, не плыве,
І маркотную песьню ніхто не пяе,—
Бо, збудзіўшысь душой, чуюць там з-за рэкі,
Хоць і ў мове чужой, сэрцу гук дарагі!..

**Максім Крыніца.**

*Ярославль на Волдзэ*

# У ДУМЕ І КАЛЯ ДУМЫ.

*101-ае заседаньне.* Гэта заседаньне робіцца трошкі цікаўшым: на ім разбіраюць справу аб выдаленьні з Думы двух дэпутатоў: аднаго ад гор. Пецербурга—*Колюбакіна* (партіі народнай свабоды) і другога ад Уфімской губ. —*Косоротова* (соціал-дэмократа). Барон *Мэйендорф* даклацывае, што Думская камісія пастанавіла выдаліць дэп. Колюбакіна і Косоротова з Думы, бо яны былі прыгаворэны судом у турму на шэсць месяцоў кожны.—Дэп. Колюбакін ў доўгай і талковай прамове выказывае, як над ім чынілі суд і за што ён сідзеў у турме Партія „Народнай свабоды“ паслала яго ў гор. Саратов; там ён гаварыў на сабраньнях, на каторых была і паліція, і паліція ніякіх прашкод яму не рабіла. „Пасьля двух месяцоў,—кажэ Колюбакін,—мяне вызвалі да жандармскага упраўленьня і там мяне сталі вінаваціць, што я гаварыў на сабраньнях у Саратове, каб неплаціць падаткоў і каб недаваць рэкрутоў. Пасьля дзела перайшло да пракурора, і той, не знайшоўшы ніякой віны, справу прэкраціў. А пасьля неяк зрабілося, што мяне ўжо пазвалі ў саратоўскую судзебную палату на разбор.—Калі ў судзе я хацеў паклікаць на сьведкоў тых паліцэйскіх, каторые слышалі, што я гаварыў, пракурор не пазволіў. Маю невіннасьць давялі і другіе сьведкі.—Ня гледзячы на гэта, мяне прысудзілі на шэсьць месяцоў у турму. Дэпутаты, вам трэба цяпер сказаць: вінен, чы невінен я.—Я спакойне чэкаю, што вы пастановіце, і я веру ў другі суд, суд ўсяго грамадзянства, каторы не пазбавіць мяне гонару“.—Дэп. *Пэргамэнт* (ад Одэссы, партіі народнай свабоды) даводзіць, што дзела Колюбакіна разбіралося

нязгодне з законам, і выказывае гэта стацьямі законоў. Дума мае свабоду паступіць з дэпутатам Колюбакіным, як сама захочэ.—Дэп. *Булат* (ад сувальскай губ. трудавік) кажэ: „дэп. Колюбакіна і Косоротова хочуць выдаліць з Думы за тое, што яны ў сваей старонцы выказалі тое, што думаюць. Кожны дэпутат — гэта прэдставіцель народа і ня мае права скрываць сваіх прakананьнёў прад тымі, што яго выбіралі“.—Дэп. *Гегечкоры* (соціал дэмократ, ад Кутаісскогой губ.) сказаў: „Мы ведаем што дэпутаты Колюбакін і Косоротов судзіліся за тое што яны неўгодны міністру“.—Дэп. *Пурышкевіч* (канцавы правы) кажэ што ўсе правые дадуць свае галасы за тое, каб гэтых дэпутатоў выдаліць.—Дэп. *Шубінскій* (акцябрыст) заяўляе, што так сама, як правые, зробяць і акцябрысты.—Дэп. *Захаров 2* (соціалдэмократ) кажэ: „Мы ведаем, што Дума зробіць тое, чаго захочэ правіцельство“.

Дума абодвых дэпутатоў пастанавіла выдаліць.

* * *

*102-ае заседаньне* Абсуждаюць, якіе адміністрацыўные парадкі завясьці на Далёкім Усходзе.

* * *

*103-ае заседаньне.* Разгледаюць надзвычайные расходы на ваеннае міністэрства. Даюць на гэта 80 мільёноў 841 тысячу рублёў. Прынімаюць ешчэ дробные праекты законоў.

* * *

*104-ае заседаньне.* Разбіраюць дробные справы: аб тым, каб даць грошы мусульманам (600 руб.) на навуку рэлігіі, і аб навучаньні польскай мовы ў вучыцельскіх сэмінарыях у Бельску і Холме.

* * *

*105-ае заседаньне.* Прыступаюць да запросу аб ніжне-тагільскіх фабрыках. На гэтых фабрыках затрымываюць расплату рабочым, вось левые хочуць, каб такіх парадкоў не было. Пастанаўляюць, каб правіцельства не выдавало пазычэк падрадчыкам, пакуль яны не заплацяць даўгоў, і каб с казны даць грошы на помач рабочым на Урале.

* * *

За гэты час у Думе трохі перэмянілася сіла партій. Правые цяпер кіруюць справамі, а не партія „17 акцябра“ як дагэтуль было.

Выйшла гэта праз „штаты марскога генэральнаго штаба“. Ешчэ ў 1906 гаду Царскім Указам заведзена асобная канцэлярыя пры марскім міністэрстве, каторая павінна была састаўляць пляны вайны на моры і др. Пэнсіі ім плацілі з астаткоў грошы. Вось, міністэрства. Столыпіна падало ў 1907 гаду ў другую Думу закон, каб Дума зацьвярдзіла расходы на гэту канцэлярыю. Але Другую Думу расьпусцілі, і яна не пасьпела зацьвярдзіць. Тагды першы Міністр Столыпін гэты закон прэдставіў у Трэцьцю Думу. Дума яго зацьвярдзіла. Але, як з усімі законамі і гэты перэслалі далей на зацьвярджэньне Гасударственаго Савету, дык Гасударственны Савет „штатоў“ не зацьвярдзіў, тлумачучы, што гэта справа належыць толькі да Гасудара Імператора, а Дума ня мае права займацца справамі аб войску і морскім флоце.

Але, калі сам міністэр Столыпін падаваў гэты закон у Думу,—дык, значыцца, ён лічыў гэта правам Думы. Усе чэкалі, што далей будзе: Калі і Гасудар не зацьвердзіць так сама пастанаўленьня Думы аб „штатах“, то Столыпін павінен выйсьці ў адстаўку. А як ён вышоў бы ў адстаўку, то зьмяніліся бы трохі парадкі. Правые думалі, што па іхнему; яны стаяць за тое, каб паменьшыць правы Думы і не пазволіць ёй чэпаць спраў ваенных і марскіх У гэтых днях выйшоў Царскі указ, па катораму закон аб „штатах“ не зацьвярджэн,—і прыказана нанова перагледзіць аснаўные законы і разабраць, якіе з іх мае права Дума разгледаць, а якіе не. Міністэрства Столыпіна пахвалілі, і ён ня выйшоў ў адстаўку.

* * *

За гэты час Дума ўслухівалася, куды павеець вецер. Неяк у Думе зрабілася ні туды, ні сюды. Правые павесялелі. Работа Думы зьмянілася, важные заканы „аб нетыкальнасьці асобы“ і аб „надзвычайных ахранах“ тым часам адлажылі на далей, бо, як кажуць, „момэнт“ цяпер не такі. Дума будзе да лета займацца толькі дробнымі законамі. Такіх дробных законоў ёсць каля 400.

Ў Думе камандзерства перайшло да умяркована — правых і правых. Камандзер умяркована — правых *П. Крупененскій* казаў: „Сурьёзные справы цяпер не час падымаць. Яны Бог ведае куды нас завядуць“...

# Хаўрусы рабочых у Бэльгіі.

У 1874 гаду ў Бэльгіі ў горадзе Гандаве зьехаліся два прыяцелі: вучоны социяліст Ван-Бэвэрэн і Поль-Дэвіт, шчыры працаўнік над палепшэньнем долі рабочаго народу. І вось, тутака яны урадзілі, што першая рэч, якая патрэбна рабочым, каб лягчэй змагацца з бядою, гэта—хаўрусы работнікоў (—прафэссіональные саюзы, хаўрусные таварыствы і друг.). Надумаўшы гэта, яны не чэкаючы прыступілі да працы над устройствам гэтакіх хаўрусоў і, падабраўшы сабе ешчэ 30 таварышоў—рабочых, аткрылі ў Гандаве першую хаўрусную „социялістычную пекарню“.

Людзі іх асьцерэгалі і казалі: „ня маеце грошы, а калі яе і аткрыеце, то вам будуць рабіць конкурэнцію багатые таргоўцы і вас зьядуць“. — Але 32 чалавекі не атстрашыліся і, маючы ўсяго капіталу каля 30 рублёў, залажылі пекарню, каторую назвалі „*Vooruit*“ (значыць „*Упярод*“). Насамперш пекарня памешчалася ў адным пакойчыку ў карчме. Пекары хаўруснікі, разносячы хлеб па гораду, падмаўлялі работнікоў, каб прылучаліся да хаўрусу.—Цяжка было знайсьці першую сотню супольнікоў, але як ужо знайшла-

ся, то за ёй пайшла другая і трэцяя, і ў 1892 гаду да гэтаго хаўрусу ўжо належало *пяць тысяч сямей* рабочых. У гэтым жэ гаду яны ўжо мелі абароту на *600 тысяч* рублёў, а чыстаго даходу *сто сорок тысяч* рублёў. Цяпер хаўрус для супольнікоў дастаўляе ня толькі хлеб, але апратку, ўсе харчы і нават лекарства. І дзела іх ідзе ўсё лепей і с кожным годам узрастае. У 1900 гаду ў хаўрусе лічылося *6 тысяч 921* супольнікоў, усяго абароту было 989 тысяч 20 рублёў, а абаротаднэй толькі пекарні дайшоў да *435 тысяч* 641 руб., і ў ёй выпекалі 200 тысяч фунтоў хлеба ў тыдзень

Усім работнікам у гэтым хаўрусе плацяць ад гадзіны працы. За гадзіну пекарам даюць 22 кап., а ў іншых пекарнях—не хаўрусных—плацяць $15^1/_2$ кап. за гадзіну. Калі работнік дажыве 65 гадоў, дастае ад хаўрусу да канца свайго жыцьця пэнсію 92 рублі ў год.

Паглядзім, што робяць хаўруснікі з даходам і што з яго вырастае.

Хто хочэ быць супольнікам хаўруса „Ўпярод", запісываецца і дастае кніжку.—Калі ён купляе, напрыклад, хлеб, каторы там каштуе за фунт 12 кап., дык пяць капеек з гэтаго адпісываюць на даход купляючаго і гэтаго даходу не выдаюць грашыма, а толькі таварам. Хаўрус такім парадкам ёсьць і „зьберэгацельнай" кассай; яго ніколі не кідаюць супольнікі-работнікі, бо ён стараецца даць ім усё, што патрэба. Хаўрус мае сваю газэту, бібліотэку, тэатр і другіе рэчы. Тутака ўся семья работніка мае ўсё, што служыць ей да жыцьця: і страву, і забаву, і навуку. І там хаўрус робіцца чымсь большым, як толькі магазынам с хлебам і апраткаю: ён робіцца вялікай сілай, каторая служыць і абаронай сваіх супольнікоў. Такі хаўрус навучае і жыць; кожны супольнік, цікавы, як што робіцца, сам мае над усім дагляд і моцна зжываецца з сваім хаўрусам

Маленкая пекарня ў Гандаве здалела злучыць у адну грамаду 30 тысяч людзей. Німа такой рэчы, каторай бы хаўрус недаў супольнікам. Калі работнік ёсьць, надзевае апратку, родзіцца, ці умірае,—ён знае, што каля яго ўся грамада, і яму неяк сьмялей жыць, лягчэй на сэрцы, што ён не адзін.

За прыкладом гораду Гандавы пайшлі і другіе гарады і пазакладывалі у сябе хаўрусы. Па ўсіх гарадох, дзе жывуць работнікі, ў Бэльгіі ёсьць і хаўрусы. І робіцца гэта ўжо ня толькі ў горадзе, але-ж і па вёсках.

Крама ў Гандаве з печывам заменілася ў магазын; таварыство супольнай помачы,—ў прафэссіональны саюз; завяліся чытальні, тэатр, школа. Пазьней усё гэта перэнясьлі ў адзін вялікі дом і назвалі яго „*Народным домам*".

Давялося і мне быць у такім „Народным доме". Зайшоў я пад вечэр да яго. Вялікі будынак—увесь збудаваны рукамі супольнікоў.—Пекны падъезд ажно блішчыць ад агнёў. Ўзышоў я ў сярэдзіну: вялікая саля.—Стаяць столікі, а пры іх сідзяць у чыстай апратцэ работнікі, пьюць гарбату і чытаюць газэты.—Пасьля гадзіны 7-ай у кожную суботу там іграе музыка з адных толькі работнікоў-супольнікоў, даюць прэдстаўленьня;—ў нядзелю, а гадзіне 2-ой, там быва-

юць чытаньня (лекціі); работнікі распытываюцца у дакладчыка аб усём і вядуць з ім гутарку. І калі я выйшоў адгэтуль, то падумаў, што шчасьце не так ужо далёка, і можна яго знайсьці ў супольнай працы ў хаўрусах. Там людзі вучацца і розных навук, і як памагаць адзін аднаму.

Добра было бы і ў нашай старонцэ пайсьці па сьлядох Бэлгіі. Вось, у Вільні маем падобнае таварыство; хаця яно толькі пачынае жыць, але можна верыць, што гэта будзе адзін с тых каменчыкоў, с каторых і у нас збудуецца „*Народны Дом*“ для вялікай сямьі працоўнікоў. **В—д.**

# АБРАЗКІ.

*(Афяровываецца Якубу Коласу).*

Я чуў, як мой брат-беларус сьпеваў свае песьні.

Божэ! Колькі мукі і енкоў ў ягоным голасе, колькі скаргі страшнай у гэтай песьні, што выходзіла з яго грудзей і смутна і нудна лілася па полі, аддавалася гулка ў лесе і падымалася выжэй і выжэй—аж да сіняго, спакойнага неба!

За сэрцэ хапала гэтая песьня — песьня мужыка-нявольніка. Загудзелі ў душы ўсе струны, з грудзей вырваўся енк і на вачах закруціліся сьлёзы..

Бедны, бяздольны народ; сьлязмі і потам залітая зямелька!

* * *

Вот вёска, дзе жывуць мае браты.

Дрэнненькие хацёнкі прыляпіліся адна да аднэй; абапол стаяць хлявы і паветкі; дзе-не-дзе угледзіш садок. Толькі рабіна, што плачэ чырвонымі сьлязмі, ды кудравая бяроза, ды хвойка век-вечны глядзяць на тваю, беларус, нядолю...

Як смутна!...

А кругом расхінулася шырокае поле. Як мурашкі, высыпаліся туды мужычкі і, сагнуўшыся над цяжкімі сахамі, аруць усохшую зямельку. Тут ўся іх надзея, ўсё іх багацтва, ўсё іх шчасьце...

* * *

Ў беднай, курнай хатцы, на канцы вёскі, гарыць лучына, уткнёная у сьцяну. На скрыпучай жэрдцы вісіць калыска, а ў ей ляжыць галоднае дзіцятка. Над ім, сагнуўшыся, стаіць маці і пяець песьню—нудную, смутную песьню; а ў тэй песьні столькі енкоў, столькі нявыплаканых сьлёзаў, што самому хочэцца разам з ёю плакаць і крычаць на ў весь сьвет: „Ратунку! Падмогі!...“

А там, у куце, на лаві варушыцца нешта пад кажухом. Гэта хворы мужык-гаспадар хочэ падняцца, каб напіцца вады—і ня

можэ. Яго кінулі сілы: цяжкая, непамерная праца падтачыла яго здароўе, і вось ён ляжыць, бедак, звесіўшы мазалістую руку, і спекшыміся губамі шэпчэ: „Піць!“, а пасьля доўга—доўга кашляець.. Відаць, што ўжо апошніе свае дні дажывае мужык. Гэта—канец гаротного жыцьця...

* * *

Вот магільнік, гдзе лежаць косьці нашых дзедоў і бацькоў.

Неколькі хвоек, ліп і бярозак з поўсотні згніўшых крыжоў—і ўсё...

Як ціха, як смутна.

Нішто не нарушае вечнаго сну нябошчыкоў,—іх адпачынку па цяжкім, бяздольным жыцьцю. Толькі часам закрычыць сава, што зьвіла сабе тут гняздо ў дупле старой ліпы, закаркае варона, закукуе-загалосіць зязюлька над мужыцкай нядолей. Заўтуруюць ей сваім шумам хвойкі і бярозы—і ізноў ўсё сціхне, засьне..

* * *

Вось ты які, мой родны край!

Смутак веець ад тваіх вёсак, ад палёў тваіх і лясоў, ад рэк і вазёраў і ад тых крыжоў, што стаяць пры дарогах. Смутак чуваць ў тваіх песьнях—скаргах, мужык беларускі; смутак і надзея ў тваіх малітвах, што да Бога шлеш.

Смутак і скарга...

Люблю цябе, мая родная старонка, мая матка—Беларусь! Ты выгадавала, мяне, ты мне паказала нядолю і сьлёзы маіх братоў...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Віджу—ўсходзяць над тобой зоркі ясные. Ўсё сьвятлей робіцца ў табе..

Веру—ўстане сонцэ, пашле яно нам свой сьвет, разгоне туман,што спавіў цябе, Беларусь!

Прыдуць для цябе лепшые часы...

Для сыноў тваіх зачнецца новае жыцьцё—вольнае, сьветлае! Стануць яны ўрад са старэйшымі сваімі братамі і дружна возьмуцца да агульнай працы, а ты, маці, паднімеш спаневераную дагэтуль галаву і сьмела будзеш пагледаць ў ясную прышласьць, што нясе тваім дзецям лепшую долю, лепшую славу!

**Піотра Просты.**

Коуна, 8/IV 1909 г.

# ЛІСТЫ З УКРАЙНЫ.

## IV.

Астатнімі часамі ў украінскіх, расейскіх і іншых выданьнях зьявілася шмат стацей аб беларускім нацыональным адрадзэньні. Апроч украінскіх газэт у Расеі,—ў газэтах „*Діло*“ і „*Руслан*“, што

выдаюцца ў Галіцкай Украйне (ў Аўстрыі), так сама надрукавана аб гэтай справе некольці вельмі прыхільных стацей і заметак.

Ў расейскім журнале „*Московскій Еженедѣльникъ*“ (№ 10, за 1909 г.) недаўна памешчэна цікавая стацьця праф. А. Погодіна, ў якой меж іншым гаворыцца, што „пачатак беларускай нацiональнай прэсы (газэт)—гэта добрая і важная для ўсяго гасударства рэч,.. што навучаньне дзетак у нізшых школах ў іх роднай мове мае вялікую для вагу справы дэмократызму“. У гэтай жэ газэце ў № 9 за 1909 г. надрукована і ст. А. Новіны аб арадзэньні беларусоў. У чэскім месячніку „*Slovanski Prehled*“ (ст. „Nar. dn. probu eni belarusů“, № 4, за 1909 г.) вельмі добра апісана, як мы, беларусы, будзімся да жыцьця. У другой чэшскай газэці „*Čas*“ (№ 16, 1909 г.) чэшскі грамадзкі працоўнік А. Чэрны знаёміць нашых братоў чэхоў з „Нашай Нівай“ і яе работай; апроч таго, ён тлумачыць чэхам, што гэта за штукі „Бѣлорусское общество“ і „Крестьянінъ“ ў Вільні і як абрусіцелі на розные спосабы хочуць запыніць беларускі рух. Польская газэта „*Wiek XX*“ (№ 13) так сама разбірае справу аб беларусах, а літоўскіе газэты „*Vıltis*“ і „*Litwa*“ афяровываюць не мала мейсца гэтай справе.

Ў зборніку „*Формы національнаго движенія въ современныхъ государствахъ*“ памешчэна праца беларуса Антона Новіны пад названьнем „*Бѣлоруссы*“. Аб гэтай працы я хачу пагаварыць на гэты раз. Гэта праца ўжо выйшла асобнай брашурай. Вось, коратка, што ў ёй знаходзім:

Ў пачатку кніжкі пан Новіна кажэ, дзе і колькі жывець беларусоў у Расеі; апіраючыся на працу праф. Карскаго, ён налічываець іх каля 9 мільёноў.

Далей гаворыцца, што беларусы ў цяперашніе часы дзеляцца на дзьве няроўные часьці: на праваслаўных (большая часць) і каталікоў (меншая часць). Беларусы-каталікі больш цягнуць да польскай культуры, беларусы-праваслаўные—да расейскай. Ў XII—XIV вв. беларусоў забрала пад сябе Літва Літоўска-рускае гасударства ня толькі не зніштожыла самабытнаго культурнаго жыцьця беларусоў, але стала перэймаць у беларусоў мову, звычаі, спосаб жыцьця, а патроху і рэлігію. Пачынаючы ад Альгерда (1345—1377 г.) ўсе граматы, ўсе гасударственые бумагі пісаліся ў беларускай мове. Толькі ў XVII ст. заместа беларускай мовы патроху зьяўляецца польская; але і ў часы польскаго панаваньня беларусы не згубілі сваей нацiональнай асобнасьці. Яны далей жывуць сваім самабытным жыцьцём, трымаючысь сваіх звычаёў, веры, зьберэгаючы сваю народную (устную) літэратуру і сваю мову.

Пасьля добра тлумачацца часы абрусіцельнай палітыкі на Беларусі. Ў 1839 г. зніштожэна унія, каторая служыла моцным грунтам для беларускай народнасьці. Ў 1867 г. забараняюць друкаваць беларускіе кніжкі. Ня лепш становіцца і экономічнае палажэньне краю. У селян нехват зямлі, каб пракарміцца; помачы німа ніякой, крэдыт надта дарагі.

Ня дзіва, што пры такіх гісторычных, палітычных і экономічных варунках жыцьця беларусы сталі цёмным, забітым народам. Аб нацiональным самапачуцьці ў гэтые часы не давадзілася і чуваць. Скрыўджэны і пагарджаны беларус стаў сароміцца ўсяго, што аддзеляе яго ад паноў, стаў нават зрэкацца сваей роднай мовы аж да апошняго часу. Нацiональнае адрадзэньне беларусоў пачалося толькі пры так-званым асвабадзіцельным руху.

Ешчэ А. Новіна перэказывае, якіе зьяўляліся творы беларускаго пісьменства, пачынаючы ад XVIII ст. Потым перэлічывае беларускіе нацiональные организацiі—хэўры, кажэ аб „Нашай Долі“, „Нашай Ніве“, Пецербурскай суполцэ „Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ“ і аб іх працы

Ідэя нацiоналізацiі школы на Беларусі, як бачым з брашуры, мейсцамі ўжо пачынае правадзіцца ў жыцьцё: ёсць ўжо нeкольκі прыватных школ, дзе навучаньне дзяцей вядзецца па-беларуску (ў Магилеўскай, Мінскай і Віленскай губ.). Патрэба вучыцелёў для гэткіх школ узрастае.

Канчае п. Новіна сваю працу такімі славамі: „Калі, ня гледзячы на непрыязнь больш моцных і культурных народнасьцей, што жывуць у Беларусі, беларускі нацiональны рух усё мацнеець і ўзрастае, калі асобные цыркуляры і розные прашкоды ня могуць затрымаць яго ўзросту, то гэта ясна паказывае немалую моц гэтаго руху і жывучасьць беларускай нацiональнасьці“.

Нам, беларусам, трэба ўжо раз стаць на верны шлях і ўзяцца самім знаёміць братоў-славяноў з нашым жыцьцем і нашымі патрэбамі, калі толькі мы хочэм увайсьці ў сямью славянскіх народоў, як раўнапраўны член гэтай сямьі. Німа чаго чэкаць, пакуль хто другі зьмілуецца напісаць аб нас. Добры прыклад гэтаму і зрабіў А. Новіна.

**Янук Журба.**

*Гор. Глухоў, Чэрнігоўскай губ.*

# Як на торфе зрабіць сенажаць.

У газэце „Хутор“ апісана, як фінляндцы тарфяные дзікіе балоты заменяюць на пекные лугі, с каторых зьбіраюць пудоў па 200—300 сена з дзесяціны. Падумаеш толькі, што у нас пры лепшых варунках і лепшай зямлі, добра лічучы, набіраецца толькі якіх 100 пудоў, а то і 60 – 40, дый бывае, што і таго менш сена з дзесяціны,—вось табе і стане яснай розніца меж гаспадаркай культурнай і первабытнай, якая у нас заведзена.

Торфяное балота, каторае хочуць замяніць на луг, фінляндцы перш-наперш асушаюць, капаючы праз кожные 10 сажнёў каналы (равы) $1^{1}/_{2}$ аршына шырынёй і аршын з чверцей глыбінёй. Зямлю з гэтых равоў раскідываюць роўненька паверх асушэнаго балота. Наверх на торф навозяць гліны вазоў па 300—400 на дзесяціну, пасьля пасыпаюць вапнай—пудоў 60—80 на дзесяціну і засьцілаюць ешчэ гноем — пудоў па два на квадратны сажэнь; каліж німа гною, то падсыпаюць мінэральные парашкі (40 пудоў каініту і 18 пудоў томасшляку). У навожэны луг раўняюць, барануючы цяжкімі жалезнымі баронамі (перш кальцавой бараной і пружыннай бараной) пакуль не раздробяцца ўсе комья і луг ня зробіцца саў-



Кальцавая барана з 8 кругамі. Такую барану пускаюць каб парэзаць дзірван.




Амэрыканская спрунжыновая барана з 9 зубамі. Такую барану пускаюць па асушэным тарфяным балоце, каб разрыхліць верхні слой.

сім гладкі і чорны. Пасьля прыступаюць да пасеву: сеюць перш віку з аўсом, каторую плытка загорываюць і барануюць ды ешчэ

на верх мешанку з зернят такіх вось траў, бяручы на дзесяціну:

| | | |
|---|---|---|
| Канюшыны чырвонай . . . . | 15 | фунтоў |
| „ швэдзкай . . . . | 10 | „ |
| „ белай . . . . . . | 2 | „ |
| Ежы (Destylis glomera a) . | 10 | фунтоў |
| Цімафееўкі . . . . . . . | 10 | „ |
| Рэйграс (Avena elatior) . . | 4 | „ |
| Авсяніцы (Festuca pratensi). | 8 | „ |
| Разам 1 пуд | 18 | фунтоў. |

Насеньня траў укачываюць гладкай качалкай. У першым ўжо гаду балота дае з дзесяціны пудоў 200 віковай мешанкі, а ў другіе гады зьбіраюць па 200—300 пудоў і больш добраго сытнаго сена.

Як відзім, людзі ў Фінляндіі змагаюцца з непрыветлівай натурай і змагаюць яе працай і знаньнем, каторае бяруць з рад вучоных людзей і добрых кніжок. У нас жэ пры лепшай зямлі і цяплейшым леці шмат лягчэй і меншым коштам можна тое самае зрабіць пры стараннасьці і ахвоце.

Польскі вучоны землероб Сэмполовскі, вучыць, як трэба папраўляць торфяные балоты у нас. Вось, відзім мы з яго рад, што ў нашым клімаценя трэба навазіць балота глінай, не канечне сыпаць і дарагіе фабрычные гнаі (каініт і томасшляк), апроч аднэй вапны, каторая канечне на торф патрэбна, каб звясьці кісьлю ў торфе. А ўсё другое: асушку, бараньбу і пасеў і у нас трэба так сама рабіць, як робяць фінляндцы.



Лугавая барана „Лякка“ да выдзіраньня моху.

Пара ўжо нам пакінуць прадвечные спосабы гаспадаркі, а прыняцца завадзіць новые – такіе, якіе заведзены у нашых культурных суседзей і якіх вымагае само жыцьцё.

Дружне возьмемся за працу каля бацькоўскай зямелькі, а згінуць, як злая мара, ліхалецьця і мор жывёлы на прадвесьні, які скрось быў гэты год ад нехвату корму. **Лішні.**

## З Беларусі і Літвы.

—о—

(Ад нашых карэспандэнтоў).

**Вільня.**—Вось недаўно схавалі добраго чалавека — доктара Олькіна, каторы ешчэ толькі пачаў жыць: яму было 26 гадоў. Усе людзі, каторых ён лячыў, спамінаюць яго добрым словам. Гэта быў чалавек, для катораго бедак і багатыр былі роўные. Памёр ён, аддаўшы сваё жыцьцё за бліжняго: ён у бальніцы пра-

сядзеў ноч пры ложку хвораго на тыфус—нейкаго бедака, каторы меў 5 чалавек дзяцей. Доктар ад гэтаго сам заразіўся гарачкай і праз тры нядзелі лёг без пары ў магілу, а бедак выздаравеў.

„Глядзіце“,—гаварылі некаторые,—„колькі хрысьцианоў праводзяць на магілкі нехрыста!“—„Ці гэта ён нехрыст?“—спыталася я.—„А вядома, жыд нехрышчоны!“ атказалі мне.—„Не! кажу я на гэта.—„Нехрыст той, хто хоць і хрысьціўся, але навукі Хрыста не трымаецца, хто беднаго ня мае за брата, хто толькі любіць сваю карысць!“

*А. П. Ян—кая.*

М. **Воложын**, Віл. Губ. Ошм. пав.—Чытаючы аб тым, што людзі маюць мала зямлі, бярэць ахвота сказаць аб валожынскай воласьці. У нашай воласьці вялікая зямельная цесната. У нас мужыцкі надзел быў ад 8 да 12 дзесяцін, а цяпер многа людзей падзяліліся на 6, 8, 10 і 16 часцей, не гаворачы аб трэцінках і чэцьверцінках. У Воложынскай воласьці жывець 13 тысяч душ, хат усяго 2 тысячы 62; з іх 673 хаты маюць менш 1 дзесяціны, 833 хаты маюць да 2 дзес., 377 хат ад 2 да 3 дзесяцін і толькі 178 хат маюць больш 3 дзес. На душу на агул выходзіць трохі больш, як палавіна дзесяціны—Зусіх валасьцей павету Воложынская найбяднейшая.

У нашым дварэ прадаецца земля па 100 руб. дзесяц., а банк дасць 40—50 рублёў, дык багаты купляе зямлю, бо можэ далажыць, а бедны ня маець сілы купіць. Так і гінем ад малоземельля; хто можэ, выежджае ў Амэрыку, у Пецербург і другіе мейсцы.

*Стары Улас.*

М. **Капыль**, Мінск. губ. Слуцк. пав.—Весела становіцца, як прачытаеш ў „Нашай Ніве“, што там і там то нашы браты беларусы аткрылі хаўрусную краму, а там бібліотэку, банчок і т. пад. карысные, добрые рэчы;—што па ўсім шырокім родным краю хутка пракацілася хваля адрадзэньня і самапачуцьця цёмнаго беларускаго люду! І ешчэ весялей робіцца, калі пачуеш і пабачыш, як рэжэ гэта варагоў нашаго адрадзэньня, як адваротна і праціўім быць сьведкамі гэтаго вялікаго перэвароту ў жыцьці! хочэцца сказаць гэтым злосным брэхуном с хэўры „Крестьяніна“, ды „Бѣлорусскаго общества“: „Эх, вы, людзі! Ласьне стрымаць вам хвалю жыцьця? Што вы варты са сваімі заядлымі мармытаньнямі і злосным крыкам?! Ўжо былі зухнейшые і мацнейшые за вас, каторым атрутаю паказвалася новае веяньне жыцьця, і то яны не змаглі спыніць яго, хоць ўселяк прашкадзалі яму... А што вы?—Пакіньце злаваць нават, а то надта брыдка будзе, як жыцьцё пакіпіць з вас!...—Але... пакуль што лямантуйце, кідайцесь на балячую голаву! Хай-жэ! А мы будзем сьмеяцца з вас і ісьці сваею дарогаю“...

Але... добра добрым пахваліцца!...

Папраўдзе,—шчасліў той чалавек, у каго на вачах перэбудоўваецца жыцьцё ад горшаго к лепшаму! І шчасліў той куток сьвету, дзе залягае пекная і плодная глеба, што дае яна скорые ў багатые усходы; а вельмі цяжка і кепска таму мейсцу, дзе трудна завясьціся чаму-небудзь добраму і карыснаму для людзей...

Вось, узяць-бы прыклад з на-

шаго убогаго мястэчка: гэта дык справедлівая афяра ўсяму ліхому ды нядобраму! Як гразнае, каламутнае балота,—стаіц на адным мейсцы (калі неідзе назад!) і цёмнае нуднае жыцьцё нашых капылян... Кожны з іх, бытцам прыдаўлены нейкаю патайною згубіцельнаю сілаю, бытцам заблуджэны ў густой непрахадзімай пушчы, бытцам спын н за рукі, ногі і галаву самымі страшэннымі запытаньнямі: „што далей? чаго чэкаць?“—як ашалелы, мнецца ў адным мейсцы і скачэ шчыглом у клетцы.. А дні, шэрые і нудные, падобные адзін на адзін, як салдаты адное роты, як вароны аднае пароды, цягнуцца цугам, адзін за адным, не датыкаючыся да жыцьця і не зменяючы яго... І гэтак нудна, і гэтак крыўда! Здаецца жывеш чалавек пасярод якіх дзікароў, на глухім востраве і праз гэта ніхто і нішто нічога ня знае... І гэта тады, як кругом, чуць не памеж нас, усё меняецца на новае, лепшае.. За тое пьянства - дык красуе! Хай дзе якое сьвята, кірмаш, ці годзяць якога пастуха, ці пасьля кожнае сходкі, —дык гарэлка. гарэлка і гарэлка без канца, а пасьля гарэлкі—сварка; за сваркаю часта бойка... Як грыбы пасьля дажджу, растуць шынкі, і скора дойдзе да таго, што сярод места будуць прадаваць гарэлку, бо шынок з манаполькай ня схопяць яе даставіць!

Сьвету, болей сьвету! Панясем мы хутка
Сілы маладые для роднаго дзела!
Будзе слоў нам пудкіх!—шчырых трэ' крыхотку!
За работу пільна, за работу сьмела!

*Цішка Гартны.*

**Беларуцкая воласць**, Мінск. губ. і пав.—26 апрыля наша неураджайная зямелька пакрылася новенькім беленькім сьняжком! Марозы прымаражывалі зямлю аж да гэтуль, травінкі нідзе і ў вочы не увідзіш. Сена, саломы німа, скаціна прападае...

У нас цяпер выбары старшыны; дагэтуль быў старшынёй чалавек хоць і ня кепскі, але ціхі і а дабро мужыкоў недбалы, дый проста парабок пісара і ешчэ нечый... Мужыкі цяпер аглядзеліся і хацелі выбраць старшынёй нейкаго Асіповіча, дык ён, як гутараць, не падабаўся пісару і яго не зацьвярдзілі.

У в *Ставішчы* хлопчык *Шыманскі* цацкаўся з рэвольвэрам і стрэліў сабе ў лоб. Ужо са дзьве нядзелі ляжыць беднае дзіцё ў Мінску ў бальніцы і мучыцца.

*Лявон Верабьёнак.*

М. **Дварэц**, Слонімск. п. Гродз. губ. Нядзелі тры таму паказаўся ў нашай старане такі жулік. Быў ён некалі арганістам. Вось пачаў ён па вёсках падгаварываць хлапцоў ехаць да валкавыскаго ксендза, бытцам за лёкая. Калі адзін хлапец з ім прыехаў да Валкавыску, то ён кажэ у заездзе: „здымай бравэрку, я яе вычышчу!“ Хлопец толькі тут ачухаўся і уцёк да хаты, зразумеўшы, што ён хочэ яго добра „ачысьціць“.

= Адна дзяўчына 3 гады была на службе ў Варшаве, сабрала грошы і ехала дамоў да вёскі *Блошны*, да бацькоў. Гэты самы чалавек пачаў сьпеваць ей, што ён арганісты, што ён хочэ з ёй ажаніцца, і яна будзе ахмістрыняй у ксендза. Дзеўка паверыла. Бацькі яе выправілі, далі кубэл адзежы. Вось гэты малады паса-

дзіў у *Жерэбілоуцэ* дзяўчыну ў вагон казаў ей чэкаць, а сам вычысьціў кубэл і уцёк з 80 руб. грошэй, што яна яму дала схаваць. Схапілася дзяўчына, зразумеўшы, што яе ашукаў жулік, але яго ўжо і след прапаў. *В.*

М. **Хоцімск**, Клімовічскаго п. Могілеўск. губ. Нашэ мястэчка мае каля 3 тысяч жыцелёў. Яно ляжыць на граніцы Смаленскай губ. У старые часы гэта быў пагранічны гарадок пажеж Літвой і Масквой і нападалі на яго то літвіны, то маскоўскае войска. Цяпэр гэта глухі кут, 42 вярсты ад ст. *Клетніца* Рыго-Орл. ж. д. —Праз наш павет не праходзіць ніякая жалезная дарога; яго прарэзае толькі Маскоўска-Варшаўскае шоссэ, што праходзіць праз Слуцк, Бабруйск, Рагачоў, Чэрыкоў. Земля тут больш пяскі, каля Хоцімска пападаюцца лепшые кавалкі...

Нячутые рэчы пачаліся ў нашым ціхім дагэтуль кутку: ў адну нядзелю некольні ўбіўстваў! У в. *Орлоуцы* ў начы напалі на манапольку; ў в. *Юзэфове* забілі стоража і забралі грошы у жыда; ў фольварку *Мужычку.* забілі ў самы палудзень пана Осмолоўскаго. Гамоняць людзі, што гэта зрабіў Савіцкі, вядомы разбойнік с Чэрнігоўшчыны. Хаця кажуць, што пана Осмолоўскаго маглі забіць і сваі, бо ён вельмі судзіўся са ўсімі. Маёнтак свой Осмолоўскі атпісаў на кадэцкі корпус (ваеннае вучылішчэ), каторы мае быць збудаваны ў яго фольварку. Народ у нас цёмны, дык і сьцежка да манапольні ніколі травой не зарастае. Газэт ніхто не чытае, аб хаўрусных крамах і суполках не чутно. А пры такіх варунках, трудна спадзевацца лепшаго жыцьця. Глушэц, аб каторым дужа спрытна пісаў Я. Купала ў № 12 „Н. Н.“ (Два мужыкі і глушэц“) да нас ешчэ не прыляцэў.

*Карусь з балота.*

---

* * *

*Пасьвячаю А. Я К.*

Прайшлі ўжо зімовы забавы,  
Мінуліся цяжкіе сны,  
І сонцэ з усьмешкай ласкавай  
Глядзіць на зямлю з вышыны.  
Німа ўжо і сьнегу на полі,  
На небі паменшала хмар,  
І моцна душою на волі  
Цяпер размахнецца песьняр.  
Тут ліпа, ў лісточкі адзета,  
Абсыпана сьвежай расой,  
І вабіць, і клічэ паэта,  
Ківае яму галавой;  
А тут і кудравы бярозы  
Ласкава пытаюць: „Аб чом  
Ты плачэш? На што гэты сьлёзы?...  
Глядзі, што за радасьць кругом!...“

**В. Каршун.**

25/IV 1909 г.  
Мелешкі Гродз губ.

---

## З усіх старон.

**Пецербург.** — *Справа Лопухіна —Азэф.* Цекавую і рэдкую справу разгледаў Сэнат: судзілі бышаго дырэктара дэпартамэнта паліціі А. А. Лопухіна; віна яго была ў тым, што ён аткрыў рэволюцьёнэром правокаторства Азэфа.

Евно Азэф, служыў у тайнай паліціі і, каб ведаць, што робіцца у рэвалюцiонэроў, ён сам прыкінуўся вялікім рэволюцiонэром і папаў нават у глаўны іх камітэт, дый належаў да боевой організацыі. Іон арганізаваў пакушэньня на высокіе асобы, але, высылаючы рэволюцiонэроў на работу, данасіў аб гэтым паліціі, каторая іх арэштовывала. Шмат людзей праз яго пайшло да турэм, на каторгу і на шыбіницу. Азэф так спрытна рабіў, што рэволюцiонэры, хаця і ведалі, што ёсьць серэд іх здрайца, але ня думалі ніколі, каб гэта мог быць Азэф. Першы стаў вінаваціць Азэфа ў здрадзе Бурцэв.—Тады ўсе таварышы на яго напалі, каб ён давёў акуратне, што Азэф здрайца, бо іначэй яму прыдзецца цяжка адпакутаваць (налажыць на сябе рукі). Бурцэв зьвярнуўся да Лопухіна, разсказаў яму ўсё, што ведаў пра Азэфа, і прасіў, каб той пацьвярдзіў, чы праўда.—Лопухін сказаў, што Азэф служыць у паліціі. Дазнаўшыся аб гэтым, рэволюцiонэры зрабілі суд ў Парыжы над Азэфам,—Бурцэв давёў віну Азэфа апіраючыся на словы Лопухіна.—

Калі правіцельства даведалося аб тым, што Азэфа судзяць і што апіраюцца на судзе на папаказаньня Лопухіна, то Лопухіна арэштавалі. Бараніў Лопухіна ў судзе адвакат Пассовэр. Іон выказываў, што Азэф тайнай паліціі прадаваў—рэволюцiонэроў а ім—тайную паліцію. Лопухін казаў, што Азэф—чалавек небеспечны, што ён лёгка можэ прадаваць, як адных, так і другіх.—Калі Бурцэв спытаўся Лопухіна аб Азэфе (ад гэтай справы залежало жыцьцё Бурцэва), то Лопухін, як страведлівы чалавек, ня мог браць на свае суменьне людзкога жыжцьця і сказаў праўду. — Лопухін кажэ, што ён ніколі не гадзіўся на тое, што робяць рэволюцiонэры, але гэтак зрабіў толькі паводлуг суменьня свайго.

Суд прыгаварыў быўшаго дырэктара дэпартамэнта паліціі саслаць ў каторгу на 5 гадоў, пазбавіць маёнтку, і ўсіх чыноў і правоў.

---

**Пэрсія.**— Шах даў амнэстыю (даравау) усім, хто проціў яго рабіў рэвалюцію, назначыў лібэральных міністроў, каторые разам с пэрсідзкім Гасударственым Саветам састаўляюць новы закон аб конституціі. Але народ ня надта верыць Шаху. Рэвалюцiонэры ня хочуць кідаць аружжа; іншые трэбуюць, каб Шах выехаў с Пэрсіі, разам з сваім глаўным памоцнікам Багадур-Джэнгам. Рускае войска на час заняло гор. Таўрыз, недалёка ад граніцы Каўказу. для абароны рускіх спраў. Некаторые пэрсы звярнуліся да младотуркоў, каб і яны прыслалі свае войска у Пэрсію, каб не было там толькі адно рускае. Турція, каторая граничыць с Пэрсіей, паслала 2 ваенные караблі.

---

**Парыж.**—Пачалася новая забастоўка пачтова - тэлеграфных чыноўнікоў. Саюзы рабочых, каторые называюцца у Франціі „сындыкатамі“, стаяць за забастоўшчыкоў. Пакуль што да забастоўкі прылучылося мала пачтавікоў; сындыкаты землекопоў і стэльмахоў абецуюць даваць помач забастоўшчыкам.

**Фінляндія.**—Выбары ў новы Сэйм ужо адбыліся. За дэпутатоў соціал-дэмократоў падаў народ 156 тысяч галасоў, за старофінскую партію—109 тысяч, за младофінскую — 61 тысяча, за шведзкую—49 тысяч, за аграрную—30 тысяч.

## Сон у турме.

Рана Сьцёпка прабудзіўся
І ляжыць—ня сьпіцца:
Сон яму такі прысьніўся—
Люба падзівіцца!
  Бытцам жыта сеяць вышлі
  У полі пры дарозі
  (Сьцёпцы нават зышло з мысьлі,
  Што ён у вастрозі).
Поле сонцэм скрось заліта,—
Шырына—раўніна!
Як-бы тукам глеба зьліта;
Чорназём, ды гліна.
  Не дакінеш проста вокам
  Да суседзкай межы,
  А на лузі іх шырокам
  Стогі—як-бы вежы!
Ўсе суседзі тут у полі
Ходзяць с карабкамі,
Сеюць жыта на прывольлі,
Рэжуць дол плугамі,
  Робяць гоні і разоркі...
  Ветрык ціха вее.
  Трохі оддаль, на прыгорку,
  Вёска іх чарнэе.
З-за мужыцкіх хат адметна
Меж гумён, адрынак
Пазірае так прыветна
Сьцёпкі ўвесь будынак...
  Углубіўся Сьцёпка ў мары,
  Думцэ ўвесь аддаўся,—
  Пра вастрог забыў, пра нары,
  Дзе ўсю ноч валяўся.
Тут ён целам, там—душою,
Там, у родным полю,
Дзе хадзіў ён за сахою,
Дзе пазнаў нядолю...
  Ды забыта ўсё ліхое,
  Ўсё, што дух смуціла,—
  Асталося дарагое,
  Што так сэрцу міла!
. . . . . . . . . . . . . .
Але скора разсьветала—
Нудны дзень вярнуўся;
Сон і мары—ўсё прапала,
Як вастрог прачнуўся.

**Якуб Колас.**

*в. Мікалаеушчына.*

Хто хочэ зарабіць крыху грошы і разам зрабіць добрую прыслугу суседзям, той нехай займаецца прадажай, слаўных дабратой **сярпоў Літоўскіх і кос стырыйскіх (Аўстрыяцкіх), маркі „каса—ручацельства“** і „Туруль“.—Тавар гэты выпісываць можна са складу




Зыгмунта Нагродзкага. *Вільня, вуліца Завальная № 11.*

Хто хочэ мець каталёг з цэнамі, той нехай аб гэтым напішэ ў склад,—вышлюць дарма.

Рэдактор-Выдаўца А. Ўласоў.

Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.